**ЗАЦВЕРДЖАНЫ:**
Пратакол агульнага сходу
заснавальнікаў Асацыяцыі
ад 03.10.2017 г.

# СТАТУТ

Асацыяцыі дызайнераў інтэр'еру і прадметна-прасторавага асяроддзя

# УСТАВ

Ассоциации дизайнеров интерьера и предметно-пространственной среды

**Мінск 2017**

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1. Асацыяцыя дызайнераў інтэр'еру і прадметна-прасторавага асяроддзя (далей па тэксце – «Асацыяцыя») з’яўляецца некамерцыйным добраахвотным аб’яднаннем юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, і ствараецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, каб садзейнічаць яе членам у дасягненні мэт, прадугледжаных дадзеным статутам (далей па тэксце – «статут»).

Асацыяцыя заснавана на членстве і створана з мэтай развіцця галін дызайну інтэр’еру і прадметна-прасторавага асяроддзя, а таксама для каардынацыі дзейнасці членаў і абароны іх інтарэсаў.

1.2. Асацыяцыя з’яўляецца некамерцыйнай арганізацыяй, дзейнічае на падставе заканадаўства Рэспублікі Беларусь і статута.

## ГЛАВА 2
## НАЗВА АСАЦЫЯЦЫІ

2.1. Поўная назва на беларускай мове: Асацыяцыя дызайнераў інтэр'еру і прадметна-прасторавага асяроддзя.

Скарочаная назва на беларускай мове: Асацыяцыя дызайнераў інтэр'еру і прадметна-прасторавага асяроддзя.

2.2. Поўная назва на рускай мове: Ассоциация дизайнеров интерьера и предметно-пространственной среды.

Скарочаная назва на рускай мове: Ассоциация дизайнеров интерьера и предметно-пространственной среды.

## ГЛАВА 3
## МЕСЦАЗНАХОДЖАННЕ АСАЦЫЯЦЫІ

3.1. Месца знаходжання Асацыяцыі: 220049, Рэспубліка Беларусь, г. Мінск, вул. Алейная, д. 17, корп. 1, пакой 19.

У выпадку змянення месцазнаходжання Асацыяцыі, Асацыяцыя на працягу 10 працоўных дзён з дня змянення месцазнаходжання абавязана накіраваць у рэгіструючы орган адпаведнае паведамленне.

## ГЛАВА 4
## ЮРЫДЫЧНЫ СТАТУС

4.1. Асацыяцыя з'яўляецца юрыдычнай асобай паводле заканадаўства Рэспублікі Беларусь, мае ва ўласнасці адасобленую маёмасць, нясе самастойную адказнасць па сваіх абавязацельствах, можа ад свайго імя набываць і ажыццяўляць маёмасныя і асабістыя немаёмасныя правы, выконваць абавязкі, быць істцом і адказчыкам у судзе, адкрываць рахункі ва ўстановах банкаў, мець пячаткі, штампы і бланкі са сваёй назвай, эмблему і іншыя рэквізіты. Асацыяцыя мае самастойны баланс.

Асацыяцыя лічыцца створанай і набывае правы юрыдычнай асобы з моманту яе дзяржаўнай рэгістрацыі.

4.2. Асацыяцыя не мае права ажыццяўляць прадпрымальніцкую дзейнасць. Калі паводле рашэння членаў Асацыяцыі на яе ўскладаецца вядзенне прадпрымальніцкай дзейнасці, Асацыяцыя мае права паводле рашэння Агульнага сходу членаў Асацыяцыі (далей па тэксце – «Агульны сход»):

4.2.1. пераўтварыцца ў гаспадарчае таварыства ці суполку ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, альбо

4.2.2. стварыць для ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці гаспадарчае таварыства, альбо ўдзельнічаць у такім таварыстве.

4.3. Асацыяцыя ўносіць змяненні ў статут у выпадках, парадку і тэрміны, прадугледжаныя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

4.4. Асацыяцыя ствараецца без абмежавання тэрміна яе дзейнасці.

## ГЛАВА 5
## МЭТЫ І ПРАДМЕТ ДЗЕЙНАСЦІ АСАЦЫЯЦЫІ

5.1. Мэтамі дзейнасці Асацыяцыі з'яўляюцца:

5.1.1. кансалідацыя членаў Асацыяцыі для ідэнтыфікацыі інтарэсаў галіны і выпрацоўкі напрамкаў вырашэння бягучых і перспектыўных мэт і задач рынку праектавання і дызайну;

5.1.2. аказанне кансультатыўнай і інфармацыйнай падтрымкі членам Асацыяцыі, каардынацыя іх дзейнасці на рынках праектавання і дызайну;

5.1.3. экспертны аналіз стану і ажыццяўлення дзейнасці па развіцці рынкаў праектавання і дызайну;

5.1.4. прасоўванне і прапаганда дзейнасці Асацыяцыі;

5.1.5. павышэнне ўзроўню дасведчанасці сярод удзельнікаў рынку праектавання і дызайну;

5.1.6. прасоўванне паслуг удзельнікаў Асацыяцыі на рынку;

5.1.7. прадстаўленне і абарона агульных маёмасных і немаёмасных інтарэсаў членаў Асацыяцыі;

5.1.8. распрацоўка, укараненне ў паўсядзённую практыку членаў Асацыяцыі правіл (стандартаў) прафесійнай дзейнасці на рынках праектавання і дызайну;

5.1.9. прадстаўленне інтарэсаў членаў Асацыяцыі і забеспячэнне ўзаемадзеяння з органамі дзяржаўнай улады і іншымі органамі, міжнароднымі арганізацыямі.

5.2. Прадметам дзейнасці Асацыяцыі з'яўляецца:

5.2.1. стварэнне спрыяльных умоў для аб'яднання спецыялістаў, якія ажыццяўляюць сваю дзейнасць у сферы праектавання і дызайну ў мэтах прафесійнага адзінства, абмену досведам, рэалізацыі творчага, навуковага патэнцыялу членаў Асацыяцыі, для транспарэнтнага абмену інфармацыяй паміж удзельнікамі рынку праектавання і дызайну;

5.2.2. садзейнічанне павышэнню кваліфікацыі і прафесійнай падрыхтоўкі кадраў у арганізацыях-членах Асацыяцыі; удзел у стварэнні сістэмы прафесійнага навучання і падрыхтоўкі кадраў з выкарыстаннем міжнародных методык і досведу;

5.2.3. правядзенне мерапрыемстваў, накіраваных на павышэнне прафесійнага ўзроўню, абмен досведам і абмеркаванне бягучых праблем рынку праектавання і дызайну (конкурсы, выставы, семінары, канферэнцыі і інш.);

5.2.4. наладжванне кантактаў і дзелавога супрацоўніцтва ў адносінах паміж членамі Асацыяцыі, кіраўнікамі і спецыялістамі членаў, якія ўваходзяць у Асацыяцыю;

5.2.5. ажыццяўленне міжнароднай дзейнасці ў мэтах узаемадзеяння, супрацоўніцтва з міжнароднымі арганізацыямі, аб'яднаннямі, якія ажыццяўляюць сваю дзейнасць на рынках праектавання і дызайну, абмену інфармацыяй, дакументамі па ўсіх пытаннях, што ўваходзяць у сферу дзейнасці Асацыяцыі;

5.2.6. дапамога дзяржаўным органам Рэспублікі Беларусь у распрацоўцы прапаноў, праграм, метадаў і нарматыўных прававых актаў, што стымулююць рэалізацыю і развіццё сферы праектавання і дызайну;

5.2.7. кансультаванне, аказанне тэхнічнай падтрымкі зацікаўленым асобам па пытаннях зместу праектаў, тэхнічнай дакументацыі, нарматыўных прававых актаў у сферы праектавання і дызайну;

5.2.8. экспертная ацэнка распрацаваных праектаў і іншых вынікаў прац у сферы праектавання і дызайну для дзяржаўных органаў, судоў, іншых арганізацый;

5.2.9. вывучэнне ўмоў ажыццяўлення дзейнасці на рынках праектавання і дызайну, а таксама абагульненне досведу прафесійнай дзейнасці членаў Асацыяцыі;

5.2.10. арганізацыя інфармацыйнай, кансультацыйнай і метадалагічнай дапамогі членам Асацыяцыі, уключаючы дапамогу ў падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы кіраўнічых кадраў, распрацоўцы інфармацыйных праграм і стварэнні банкаў дадзеных па кадрах спецыялістаў для працы на рынках праектавання і дызайну;

5.2.11. арганізацыя і правядзенне мерапрыемстваў, распрацоўка і рэалізацыя праектаў, аказанне паслуг і вырашэнне іншых мэт і задач, якія не супярэчаць заканадаўству Рэспублікі Беларусь і статуту, у тым ліку накіраваны на павышэнне прэстыжу дзейнасці на рынках праектавання і дызайну;

5.2.12. падрыхтоўка аглядаў і прагнозаў, даследаванняў развіцця рынку праектавання і дызайну, ацэнка камерцыйнага патэнцыялу аб'ектаў нерухомасці і прадстаўленне гэтай інфармацыі членам Асацыяцыі і зацікаўленым бакам для развіцця

прадпрымальніцкай дзейнасці;

5.2.13. наладжванне канструктыўных узаемаадносін з іншымі суб'ектамі, якія звязаны з рынкамі праектавання і дызайну і маюць аналагічныя мэты ў Рэспубліцы Беларусь і за мяжой;

5.2.14. уцягванне зацікаўленых асоб у развіццё рынку праектавання і дызайну;

5.2.15. супрацоўніцтва са сродкамі масавай інфармацыі і забеспячэнне ўзаемадзеяння з імі членаў Асацыяцыі і іншых суб'ектаў у мэтах распаўсюду інфармацыі пра асаблівасці працы на рынках праектавання і дызайну;

5.2.16. распрацоўка і вызначэнне патрабаванняў, што прад'яўляюцца да асоб, якія жадаюць уступіць у Асацыяцыю, а таксама распрацоўка і прыняцце правіл (стандартаў) прафесійнай дзейнасці і прафесійнай этыкі членаў Асацыяцыі, ажыццяўленне кантролю іх выканання;

5.2.17. аказанне дапамогі ў пытаннях абароны правоў на вынікі інтэлектуальнай дзейнасці і прыраўнаваныя да іх сродкі індывідуалізацыі юрыдычнай асобы, прадукцыі, выкананых прац і (ці) паслуг;

5.2.18. ажыццяўленне іншай дзейнасці, неабходнай для дасягнення статутных мэт і задач Асацыяцыі і не забароненай заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

5.2.19. Асацыяцыя не мае мэтай атрыманне прыбытку і не размяркоўвае атрыманы прыбытак паміж членамі Асацыяцыі.

## ГЛАВА 6
## ЧЛЕНСТВА Ў АСАЦЫЯЦЫІ

6.1. Членства ў Асацыяцыі і выхад з яе з'яўляюцца добраахвотнымі.

6.2. Членамі Асацыяцыі могуць быць камерцыйныя арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі, якія ажыццяўляюць дзейнасць у сферы праектавання і дызайну, адпавядаюць крытэрыям, вызначаным Праўленнем Асацыяцыі.

6.3. Членамі Асацыяцыі з'яўляюцца яе Заснавальнікі, а таксама іншыя асобы, прынятыя ў Асацыяцыю ў парадку, вызначаным статутам. Члены Асацыяцыі захоўваюць самастойнасць і правы юрыдычнай асобы (індывідуальнага прадпрымальніка).

Змяненне ў складзе членаў Асацыяцыі не цягне за сабой абавязак па ўнясенні адпаведных змяненняў у палажэнні статута.

6.4. Заснавальнікі Асацыяцыі і члены, прынятыя ў Асацыяцыю пасля яе дзяржаўнай рэгістрацыі, маюць роўныя правы і абавязкі. Палажэнні статута ў роўнай ступені распаўсюджваюцца як на Заснавальнікаў Асацыяцыі, так і на астатніх яе членаў.

6.5. Парадак і ўмовы прыёму членаў Асацыяцыі:

6.5.1. Асоба, якая жадае ўступіць у Асацыяцыю, падае на імя Старшыні Асацыяцыі пісьмовую заяву з просьбай пра прыём у члены Асацыяцыі, а таксама наступныя дакументы:

копіі статута, пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі;

заяву-анкету, што змяшчае асноўныя звесткі пра арганізацыю, пералік якіх зацвярджаецца Праўленнем Асацыяцыі;

іншыя дакументы, якія пацвярджаюць адпаведнасць крытэрыям членства ў Асацыяцыі.

Старшыня Асацыяцыі мае права запытаць у кандыдата ў члены Асацыяцыі дадатковыя дакументы і інфармацыю.

6.5.2. Агульны сход на найбліжэйшым паседжанні разглядае заяву асобы, якая жадае ўступіць у Асацыяцыю, і выносіць рашэнне пра прыём заяўніка ў члены Асацыяцыі, або пра адмову прыняць заяўніка ў члены Асацыяцыі.

6.5.3. Рашэнне пра адмову прыняць заяўніка ў члены Асацыяцыі даводзіцца да ведама заяўніка ў тыднёвы тэрмін з дня прыняцця рашэння.

6.5.4. У выпадку рэарганізацыі юрыдычнай асобы – члена Асацыяцыі, яго правапераемнікі захоўваюць права членства ў Асацыяцыі пры ўмове атрымання згоды Агульнага сходу.

6.5.5. Агульны сход мае права адмовіць правапераемніку рэарганізаванай юрыдычнай асобы – члена Асацыяцыі ў захаванні членства. У гэтым выпадку правапераемнік рэарганізаванай юрыдычнай асобы - члена Асацыяцыі мае права звярнуцца з заявай пра яго прыём у члены Асацыяцыі ў парадку, вызначаным падпунктам. 6.5.1. дадзенага статута.

6.5.6. Пры прыёме ў члены Асацыяцыі кандыдат у члены Асацыяцыі павінен быць у абавязковым парадку азнаёмлены са статутам.

Ва ўсім астатнім, што не ўрэгулявана статутам, парадак і правілы прыёму членаў Асацыяцыі вызначаюцца рашэннямі Праўлення.

6.6. Членства ў Асацыяцыі можа быць спынена па наступных падставах:

6.6.1. выхад з Асацыяцыі;

6.6.2. выключэнне з Асацыяцыі;

6.6.3. выбыццё з Асацыяцыі.

6.7. Выхад з Асацыяцыі:

6.7.1. Член Асацыяцыі мае права паводле свайго меркавання выйсці з Асацыяцыі па сканчэнні фінансавага года.

6.7.2. Выхад члена Асацыяцыі ажыццяўляецца па яго заяве на падставе рашэння Агульнага сходу. Заява пра выхад падаецца на імя Старшыні Асацыяцыі.

Выхад члена Асацыяцыі з Асацыяцыі вызначаецца з даты, пазначанай у заяве, якая не можа быць раней дня сканчэння бягучага фінансавага года, або з дня сканчэння бягучага фінансавага года - у выпадку, калі дата выхаду не пазначана ў заяве пра выхад з Асацыяцыі.

6.7.3. У выпадку выхаду з Асацыяцыі член Асацыяцыі нясе субсідыярную адказнасць па абавязацельствах Асацыяцыі прапарцыйна свайму ўнёску на працягу двух гадоў з моманту выхаду, калі гэтыя абавязацельствы ўзніклі падчас яго членства ў Асацыяцыі.

Выхад з Асацыяцыі не ўплывае на абавязкі былога члена Асацыяцыі па выплаце членскіх унёскаў і любых іншых запазычанасцяў перад Асацыяцыяй, якія ўзніклі да моманту яго выхаду з членаў Асацыяцыі.

6.8. Выключэнне з Асацыяцыі:

6.8.1. Член Асацыяцыі можа быць выключаны з Асацыяцыі паводле рашэння Агульнага сходу ў выпадку:

сістэматычнага ці грубага парушэння абавязкаў члена Асацыяцыі;

перашкаджэння членам Асацыяцыі ажыццяўляць дзейнасць Асацыяцыі;

сістэматычнай (2 і больш разоў) няплаты членскіх унёскаў;

неадпаведнасці члена Асацыяцыі патрабаванням, пазначаным у пункце 6.2. статута;

ажыццяўлення членам Асацыяцыі дзейнасці, якая дыскрэдытуе Асацыяцыю і (ці) членаў Асацыяцыі;

сістэматычнага ўхілення члена Асацыяцыі ад удзелу ў працы Асацыяцыі.

6.8.2. Рашэнне пра выключэнне прымаецца Агульным сходам.

Член Асацыяцыі лічыцца выключаным з дня, які ідзе за днём прыняцця рашэння пра выключэнне.

Інфармацыя пра прынятае рашэнне пра выключэнне з Асацыяцыі даводзіцца да ведама выключанага члена Асацыяцыі. Паведамленне накіроўваецца па адрасе, пазначаным у спісе членаў Асацыяцыі, праз паштовую сувязь ці іншым спосабам, які забяспечвае сапраўднасць паведамленняў падчас іх перадачы і прыняцця і іх дакументальнае пацверджанне.

6.9. Выбыццё з Асацыяцыі:

Выбыццё асобы з Асацыяцыі вызначаецца з моманту ліквідацыі юрыдычнай асобы (спынення дзейнасці індывідуальнага прадпрымальніка).

6.10. Пры спыненні членства ў Асацыяцыі матэрыяльныя сродкі, занесеныя членам на ажыццяўленне статутных мэт Асацыяцыі, вяртанню не падлягаюць, калі іншае не абумоўлена пры іх перадачы.

## ГЛАВА 7
## ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ ЧЛЕНАЎ АСАЦЫЯЦЫІ

7.1. Члены Асацыяцыі ўдзельнічаюць у працы Агульнага сходу праз прадстаўнікоў. Прадстаўнікі могуць быць сталымі ці прызначанымі на пэўны тэрмін. Прадстаўніцтва можа быць заснавана на службовых паўнамоцтвах, або афармляецца належным чынам аформленай даверанасцю. Член Асацыяцыі мае права ў любы час замяніць свайго прадстаўніка ў агульным сходзе, паведаміўшы пра гэта Старшыні Асацыяцыі (асобе, якая выконвае абавязкі Старшыні).

7.2. Члены Асацыяцыі маюць права:

7.2.1. бязвыплатна карыстацца паслугамі Асацыяцыі ў парадку і на ўмовах, прадугледжаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і статутам;

7.2.2. карыстацца пераважным правам удзелу ў мерапрыемствах, якія праводзіць Асацыяцыя;

7.2.3. звяртацца да Асацыяцыі па абарону сваіх правоў і законных інтарэсаў;

7.2.4. звяртацца да Асацыяцыі па кансультатыўную, метадычную і іншую дапамогу;

7.2.5. удзельнічаць у мерапрыемствах, якія праводзяцца Асацыяцыяй;

7.2.6. карыстацца скідкамі і льготамі, вызначанымі для членаў Асацыяцыі;

7.2.7. удзельнічаць у кіраванні Асацыяцыяй у парадку і на ўмовах, вызначаных статутам;

7.2.8. выбіраць і быць выбранымі ў органы кіравання Асацыяцыі;

7.2.9. уносіць на разгляд кіраўнічых органаў Асацыяцыі прапановы па пытаннях дзейнасці Асацыяцыі і ўдзельнічаць у абмеркаванні гэтых пытанняў;

7.2.10. патрабаваць склікання пазачарговага Агульнага сходу;

7.2.11. уносіць прапановы ў парадак дня Агульнага сходу;

7.2.12. кантраляваць дзейнасць Асацыяцыі ў парадку, вызначаным статутам;

7.2.13. атрымліваць інфармацыю пра дзейнасць Асацыяцыі ў парадку, прадугледжаным статутам;

7.2.14. перадаваць маёмасць ва ўласнасць Асацыяцыі;

7.2.15. па сваім меркаванні выйсці з Асацыяцыі ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і статутам;

7.2.16. мець іншыя правы, прадугледжаныя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і статутам.

7.3. Члены Асацыяцыі абавязаны:

7.3.1. браць актыўны ўдзел у дзейнасці Асацыяцыі, садзейнічаць дасягненню мэт дзейнасці і развіццю Асацыяцыі;

7.3.2. выконваць патрабаванні заканадаўства Рэспублікі Беларусь, статута, лакальных нарматыўных прававых актаў Асацыяцыі;

7.3.3. не дапускаць дзеянняў, якія чыняць шкоду Асацыяцыі;

7.3.4. выконваць рашэнні органаў кіравання Асацыяцыі;

7.3.5. своечасова выплачваць уступныя і членскія ўнёскі ў парадку, памерах і ў тэрміны, вызначаныя Праўленнем;

7.3.6. не разгалашаць трэцім асобам канфідэнцыйную інфармацыю, звязаную з дзейнасцю Асацыяцыі і членаў Асацыяцыі;

7.3.7. інфармаваць Старшыню Асацыяцыі пра любыя змяненні звестак, пазначаных у п. 6.5.1. статута.

7.3.8. несці іншыя абавязкі, прадугледжаныя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, статутам.

7.4. Атрыманне інфармацыі пра Асацыяцыю і (ці) азнаямленне з дакументамі Асацыяцыі ажыццяўляецца па месцы знаходжання Асацыяцыі. Член Асацыяцыі (яго належна ўпаўнаважаны прадстаўнік), які жадае атрымаць інфармацыю пра Асацыяцыю і (ці) азнаёміцца з дакументамі Асацыяцыі, накіроўвае адпаведны пісьмовы запыт на імя Старшыні Асацыяцыі. Не пазней за 15 (пятнаццаць) працоўных дзён з дня атрымання такога запыту Старшыня Асацыяцыі накіроўвае асобе, якая зрабіла гэты запыт, паведамленне, што змяшчае інфармацыю пра магчымыя месцы і тэрміны азнаямлення з запытанай інфармацыяй і (ці) дакументамі. Па ўзгадненні са Старшынёй Асацыяцыі інфармацыя пра Асацыяцыю і (ці) копіі запытаных дакументаў могуць быць накіраваны члену Асацыяцыі (яго належным чынам ўпаўнаважанаму прадстаўніку) праз паштовую сувязь (заказным лістом з паведамленнем пра ўручэнне). За прадстаўленне Асацыяцыяй інфармацыі ў выглядзе копій дакументаў можа спаганяцца плата, памер якой не павінен перавышаць выдаткі на выраб гэтых копій і іх дастаўкі.

## ГЛАВА 8
## МАЁМАСЦЬ АСАЦЫЯЦЫІ

8.1. Асацыяцыя можа мець ва ўласнасці любую маёмасць, неабходную для забеспячэння дзейнасці Асацыяцыі, прадугледжанай статутам, за выключэннем аб'ектаў, якія паводле заканадаўства Рэспублікі Беларусь могуць знаходзіцца толькі ва ўласнасці дзяржавы.

Маёмасць Асацыяцыі складаюць яе асноўныя фонды, абаротныя сродкі і іншыя матэрыяльныя каштоўнасці, кошт якіх адлюстроўваецца ў бухгалтарскім балансе Асацыяцыі.

8.2. Асацыяцыя не мае права ўласнасці на маёмасць членаў Асацыяцыі, а члены Асацыяцыі не маюць маёмасных правоў у дачыненні да Асацыяцыі.

8.3. Маёмасць Асацыяцыі фарміруецца і папаўняецца за кошт унёскаў і іншых крыніц, прадугледжаных статутам.

8.4. Крыніцамі фарміравання маёмасці Асацыяцыі з'яўляюцца:

- уступныя, членскія і мэтавыя ўнёскі членаў Асацыяцыі;
- прыбыткі, атрыманыя ад вытворча-гаспадарчай дзейнасці гаспадарчых таварыстваў, у якіх Асацыяцыя з'яўляецца ўдзельнікам (акцыянерам);
- добраахвотныя маёмасныя ўнёскі і ахвяраванні юрыдычных і фізічных асоб;
- іншыя, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, паступленні.

8.5. Члены Асацыяцыі выплачваюць унёскі шляхам пералічэння адпаведных грашовых сродкаў на рахунак Асацыяцыі.

Памер, перыядычнасць і тэрміны выплаты ўнёскаў вызначаюцца Праўленнем.

## ГЛАВА 9
## АДКАЗНАСЦЬ АСАЦЫЯЦЫІ І ЯЕ ЧЛЕНАЎ

9.1. Асацыяцыя адказвае па сваіх абавязацельствах усёй прыналежнай ёй маёмасцю, у дачыненні якой паводле заканадаўстве можа быць ужыта спагнанне.

9.2. Асацыяцыя не адказвае па абавязацельствах сваіх членаў.

9.3. Члены Асацыяцыі салідарна нясуць субсідыярную адказнасць па абавязацельствах Асацыяцыі ў памеры 10% ад сумы ўступнага ўнёску. Перш чым прад’явіць патрабаванне да члена Асацыяцыі, крэдытор павінен прад'явіць патрабаванне да Асацыяцыі.

9.4. Члены Асацыяцыі захоўваюць самастойнасць і правы юрыдычнай асобы.

## ГЛАВА 10
## ФІЛІЯЛЫ, ПРАДСТАЎНІЦТВЫ

10.1. Асацыяцыя мае права ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь ствараць адасобленыя падраздзяленні (філіялы, прадстаўніцтвы).

10.2. Прадстаўніцтвы і філіялы не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі і дзейнічаюць ад імя Асацыяцыі на падставе палажэнняў пра іх, зацверджанных Асацыяцыяй. Яны надзяляюцца маёмасцю Асацыяцыі, якая ўлічваецца асобна на балансе Асацыяцыі.

10.3. На момант дзяржаўнай рэгістрацыі дадзенага статута Асацыяцыя не мае адасобленых структурных падраздзяленняў (філіялаў і прадстаўніцтваў).

## ГЛАВА 11
## ПАРАДАК КІРАВАННЯ ДЗЕЙНАСЦЮ АСАЦЫЯЦЫІ

11.1. Органамі Асацыяцыі з'яўляюцца органы кіравання Асацыяцыі і яе кантрольныя органы.

11.2. Кіраванне дзейнасцю Асацыяцыі ажыццяўляюць, у межах сваёй кампетэнцыі, наступныя органы:

11.2.1. Агульны сход;

11.2.2. Праўленне Асацыяцыі;

11.2.3. Старшыня Асацыяцыі - аднаасобны выканаўчы орган Асацыяцыі, які ажыццяўляе бягучае кіраўніцтва дзейнасцю Асацыяцыі.

11.3. Кантрольным органам Асацыяцыі з'яўляецца Рэвізор.

## ГЛАВА 12
## АГУЛЬНЫ СХОД ЧЛЕНАЎ АСАЦЫЯЦЫІ

12.1. Агульны сход з'яўляецца вышэйшым органам кіравання Асацыяцыі.

12.2. Асобамі, якія маюць права на ўдзел у Агульным сходзе, з'яўляюцца члены Асацыяцыі.

Індывідуальныя прадпрымальнікі, якія з'яўляюцца членамі Асацыяцыі, маюць права ўдзельнічаць у Агульным сходзе асабіста або праз прадстаўніка, упаўнаважанага на тое натарыяльна засведчанай даверанасцю.

Юрыдычныя асобы, якія з'яўляюцца членамі Асацыяцыі, на Агульным сходзе прадстаўлены іх кіраўнікамі або асобамі, упаўнаважанымі на тое належным чынам афармленай даверанасцю.

12.3. У выпадках і парадку, вызначаных заканадаўствам і статутам, склікаюцца і праводзяцца чарговыя і пазачарговыя Агульныя сходы. Падрыхтоўку, скліканне і правядзенне Агульнага сходу ажыццяўляе Старшыня Асацыяцыі.

12.4. Чарговыя Агульныя сходы праводзяцца не радзей аднаго разу ў год і не пазней за тры месяцы па сканчэнні фінансавага года. Першы фінансавы год Асацыяцыі вызначаецца з даты яе рэгістрацыі да 31 снежня года, у якім адбылася яе рэгістрацыя.

12.5. Пазачарговы Агульны сход праводзіцца ў любых выпадках, калі правядзенне такога сходу патрабуецца ў інтарэсах Асацыяцыі ці яе членаў.

Пазачарговы Агульны сход праводзіцца па рашэнні Старшыні Асацыяцыі на падставе:

12.5.1. уласнай ініцыятывы Старшыні Асацыяцыі;

12.5.2. патрабавання Праўлення Асацыяцыі;

12.5.3. патрабавання Рэвізора Асацыяцыі;

12.5.4. патрабавання не меней за 2/3 членаў Асацыяцыі.

Старшыня Асацыяцыі ў тэрмін не больш за 10 (дзесяць) працоўных дзён з даты атрымання патрабавання пра правядзенне пазачарговага Агульнага сходу, абавязаны разгледзець гэтае патрабаванне і прыняць рашэнне пра скліканне і правядзенне гэтага сходу або матываванае рашэнне пра адмову ў яго скліканні і правядзенні. Любое з прынятых рашэнняў павінна быць накіравана асобам, якія патрабуюць склікання пазачарговага Агульнага збору, не пазней за 10 (дзесяць) працоўных дзён з даты яго прыняцця.

Рашэнне пра адмову ў правядзенні пазачарговага Агульнага сходу можа быць прынята Старшынёй Асацыяцыі толькі ў выпадку:

- калі не выкананы вызначаны статутам парадак прад'яўлення патрабавання пра правядзенне пазачарговага Агульнага сходу;

- калі ніводнае з пытанняў, прапанаваных для ўключэння ў парадак дня пазачарговага Агульнага сходу, не датычыцца да яго кампетэнцыі ці не адпавядае патрабаванням заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

Калі адно ці некалькі пытанняў, прапанаваных для ўключэння ў парадак дня пазачарговага Агульнага сходу, не датычацца да кампетэнцыі Агульнага сходу ці не адпавядаюць патрабаванням заканадаўства Рэспублікі Беларусь, гэтыя пытанні не ўключаюцца ў парадак дня.

Старшыня Асацыяцыі абавязаны на працягу 10 (дзесяці) працоўных дзён з моманту прыняцця рашэння пра правядзенне пазачарговага Агульнага сходу разаслаць паведамленні пра правядзенне пазачарговага Агульнага сходу.

Паведамленні накіроўваюцца членам Асацыяцыі праз паштовую сувязь або па электроннай пошце. Паведамленне, накіраванае па электроннай пошце, лічыцца атрыманым адпаведным членам Асацыяцыі ў дзень яго адпраўлення.

Паведамленне павінна змяшчаць звесткі пра дату, час і месца правядзення пазачарговага Агульнага сходу, а таксама пытанні, прапанаваныя органам (асобай) – ініцыятарам правядзення пазачарговага Агульнага сходу. Пазачарговы Агульны сход павінен быць праведзены не пазней за 30 (трыццаць) працоўных дзён з даты прыняцця Старшынёй Асацыяцыі рашэння пра скліканне і правядзенне гэтага сходу.

У выпадку калі Старшынёй Асацыяцыі на працягу тэрміна, вызначанага дадзеным пунктам, не прынята рашэнне пра скліканне і правядзенне пазачарговага Агульнага сходу, або прынята рашэнне пра адмову ў яго скліканні і правядзенні, то пазачарговы Агульны сход можа быць скліканы органамі ці членамі Асацыяцыі, якія патрабуюць яго правядзенне. Пры гэтым органы ці члены Асацыяцыі, якія склікаюць пазачарговы Агульны сход, маюць адпаведныя паўнамоцтвы Старшыні Асацыяцыі.

12.6. Асобы, якія маюць права на ўдзел у Агульным сходзе, апавяшчаюцца пра прынятае рашэнне пра правядзенне Агульнага сходу не менш чым за 10 (дзесяць) дзён да даты яго правядзення. Паведамленне пра правядзенне паўторнага Агульнага сходу павінна быць накіравана не менш чым за 5 (пяць) дзён да даты яго правядзення.

Пра скліканне Агульнага сходу кожны член Асацыяцыі павінен быць апавешчаны па адрасе, пазначаным у спісе членаў Асацыяцыі, праз паштовую сувязь ці іншым спосабам, які забяспечвае сапраўднасць паведамленняў падчас іх перадачы і прыняцця і іх дакументальнае пацверджанне.

Паведамленне пра скліканне Агульнага сходу павінна змяшчаць:

- дату, час і месца правядзення Агульнага сходу;
- парадак дня Агульнага сходу.

12.7. Парадак дня Агульнага сходу фарміруецца Старшынёй Асацыяцыі па сваім меркаванні з улікам прапаноў асоб, якія маюць права на ўнясенне прапаноў у парадак дня. Парадак дня Агульнага сходу павінен змяшчаць вычарпальны пералік канкрэтна сфармуляваных пытанняў, якія выносяцца на абмеркаванне. Нароўні з пытаннямі, прапанаванымі для ўключэння ў парадак дня пазачарговага Агульнага сходу, Старшыня Асацыяцыі па ўласнай ініцыятыве мае права ўключаць у яго дадатковыя пытанні. Асобы, якія маюць права на ўдзел у Агульным сходзе, маюць права ўнесці ў пісьмовай форме прапановы пра ўключэнне пытанняў у парадак дня Агульнага сходу. Прапановы адрасуюцца Старшыні Асацыяцыі і могуць быць накіраваны не пазней чым за 15 (пятнаццаць) каляндарных дзён да даты правядзення Агульнага сходу. Прапанова ў парадак дня Агульнага сходу павінна змяшчаць назву юрыдычнай асобы (прозвішча, імя і імя па бацьку індывідуальнага прадпрымальніка) і фармулёўку кожнага з прапанаваных у парадак дня пытанняў. Асобы, якія маюць права на ўнясенне прапаноў у парадак дня, могуць таксама прапанаваць фармулёўку праекта рашэння па кожным з прапанаваных пытанняў. Прапанова павінна быць падпісана асобамі, якія яе ўнеслі.

У выпадку прыняцця рашэння пра змяненне парадку дня Агульнага сходу, вызначанага пры прыняцці рашэння пра яго скліканне і правядзенне, Старшыня Асацыяцыі абавязаны паведаміць пра гэта змяненне асобам, якія маюць права на ўдзел у Агульным сходзе, але не менш чым за 2 (два) каляндарныя дні да даты яго правядзення.

Паведамленні накіроўваюцца членам Асацыяцыі праз паштовую сувязь або па электроннай пошце. Паведамленне, накіраванае па электроннай пошце, лічыцца атрыманым адпаведным членам Асацыяцыі ў дзень яго адпраўлення.

12.8. Агульны сход мае права прымаць рашэнні па любых пытаннях дзейнасці Асацыяцыі.

Да выключнай кампетэнцыі Агульнага сходу датычацца:

12.8.1. вызначэнне асноўных напрамкаў дзейнасці Асацыяцыі;

12.8.2. зацвярджэнне назвы Асацыяцыі, статута, унясенне ў статут змяненняў і дадаткаў, калі іншае не прадугледжана статутам;

12.8.3. прыняцце новых членаў у Асацыяцыю;

12.8.4. выключэнне членаў з Асацыяцыі;

12.8.5. разгляд скаргаў на рашэнні Праўлення Асацыяцыі, Старшыні Асацыяцыі, Рэвізора Асацыяцыі;

12.8.6. прыняцце рашэння пра ліквідацыю ці рэарганізацыю Асацыяцыі;

12.8.7. выбранне і спыненне паўнамоцтваў членаў Праўлення, Рэвізора Асацыяцыі, вызначэнне памеру ўзнагарод і кампенсацыі выдаткаў членам Праўлення, Рэвізору Асацыяцыі за выкананне імі сваіх абавязкаў;

12.8.8. зацвярджэнне гадавых планаў працы Асацыяцыі і арганізацыя іх выканання;

12.8.9. зацвярджэнне гадавога балансу (справаздач) і каштарыса выдаткаў Асацыяцыі, ажыццяўленне кантролю за яго выкананнем;

12.8.10. вырашэнне іншых пытанняў, прадугледжаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, статутам.

12.9. Па пытаннях, пазначаных у падпунктах 12.8.4, 12.8.6. статута, рашэнні прымаюцца не менш чым дзвюма трацінамі галасоў ад агульнага ліку галасоў членаў Асацыяцыі (іх прадстаўнікоў), што прысутнічаюць на паседжанні Агульнага сходу.

Па пытаннях, пазначаных у падпунктах 12.8.2 і 12.8.3, рашэнні прымаюцца не менш чым трыма чацвёртымі галасоў ад агульнага ліку галасоў членаў Асацыяцыі (іх прадстаўнікоў), што прысутнічаюць на паседжанні Агульнага сходу.

Па пытанні, пазначаным ў падпункце 12.8.4. статута, член Асацыяцыі (яго прадстаўнік), які выключаецца з Асацыяцыі, у галасаванні не ўдзельнічае.

Па ўсіх астатніх пытаннях, акрамя выпадкаў, прадугледжаных статутам, рашэнні прымаюцца простай большасцю галасоў ад агульнага ліку галасоў членаў Асацыяцыі (іх прадстаўнікоў), што прысутнічаюць на паседжанні Агульнага сходу.

Прыняцце рашэнняў па пытаннях, пазначаных у пункце 12.8. статута, датычыцца да выключнай кампетэнцыі Агульнага сходу Асацыяцыі і не можа быць перададзена на вырашэнне іншых органаў Асацыяцыі.

12.10. Агульны сход праводзіцца ў вочнай форме. У выпадку немагчымасці непасрэднай прысутнасці аднаго ці некалькіх членаў Асацыяцыі на Агульным сходзе дапускаецца правядзенне Агульнага сходу з выкарыстаннем відэаканферэнцсувязі. Парадак правядзення агульнага сходу з выкарыстаннем відэаканферэнцсувязі вызначаецца Праўленнем Асацыяцыі.

12.11. Удзельнікамі Агульнага сходу лічацца асобы, зарэгістраваныя для ўдзелу ў ім.

Пры правядзенні Агульнага сходу рэгістрацыя асоб, якія маюць права на ўдзел у Агульным сходзе, ажыццяўляецца пры прад'яўленні імі дакументаў, што пацвярджаюць іх паўнамоцтвы, і вызначаецца правамоцтва (наяўнасць кворуму) гэтага сходу. Парадак рэгістрацыі асоб, якія маюць права на ўдзел у Агульным сходзе, вызначаецца ў рашэнні пра скліканне і правядзенне Агульнага сходу. Асобы, якія не прайшлі рэгістрацыю, не маюць права браць удзел у галасаванні.

12.12. Агульны сход прызнаецца правамоцным (мае кворум) у выпадку, калі ў ім бралі ўдзел больш за 50 (пяцьдзесят) працэнтаў членаў Асацыяцыі.

У выпадку адсутнасці вызначанага кворуму чарговы Агульны сход павінен быць праведзены, а пазачарговы Агульны сход можа быць праведзены паўторна з тым жа парадкам дня. Паўторны Агульны сход мае кворум, калі ў ім бралі ўдзел больш за 30 (трыццаць) працэнтаў членаў Асацыяцыі.

12.13. Агульны сход не мае права прымаць рашэнні па пытаннях, не ўключаных у парадак дня гэтага сходу, а таксама змяняць яго парадак дня, за выключэннем аднагалоснага прыняцця рашэння Агульным сходам, у працы якога бяруць удзел усе асобы, што маюць права на ўдзел у гэтым Агульным сходзе.

12.14. Паседжаннем Агульнага сходу кіруе Старшыня Асацыяцыі. У выпадку немагчымасці ўдзелу Старшыні Асацыяцыі ў працы Агульнага сходу, паседжаннем кіруе асоба, прызначаная Старшынёй Асацыяцыі.

Вядзенне пратаколу Агульнага сходу ажыццяўляе Сакратар гэтага сходу, прызначаны Старшынёй Асацыяцыі.

12.15. Пры галасаванні на Агульным сходзе кожны член Асацыяцыі мае адзін голас.

12.16. Рашэнні Агульнага сходу прымаюцца ў форме адкрытага галасавання, калі іншае не вызначана рашэннем Агульнага сходу.

12.17. Па выніках правядзення Агульнага сходу не пазней чым за 15 (пятнаццаць) працоўных дзён пасля яго закрыцця складаецца пратакол Агульнага сходу ў двух экзэмплярах. Пратакол падпісваецца Старшынёй Асацыяцыі (або асобай, якая старшынствавала на Агульным сходзе) і Сакратаром сходу.

Рашэнні, прынятыя Агульным сходам, апавяшчаюцца на гэтым сходзе. Члены Асацыяцыі, якія адсутнічалі на сходзе, маюць права азнаёміцца з пратаколамі сходу ў парадку, прадугледжаным п. 7.4. статута.

## ГЛАВА 13
## ПРАЎЛЕННЕ АСАЦЫЯЦЫІ

13.1. Кіраўніцтва дзейнасцю Асацыяцыі ў перыяд паміж Агульнымі сходамі ажыццяўляецца Праўленнем Асацыяцыі.

13.2. Колькасць членаў Праўлення Асацыяцыі павінна складаць не меней за 3 і не больш за 9 членаў.

Члены Праўлення выбіраюцца Агульным сходам. Галасаванне адбываецца па кожнай кандыдатуры простай большасцю галасоў ад агульнага ліку галасоў членаў Асацыяцыі (іх прадстаўнікоў), што прысутнічаюць на паседжанні Агульнага сходу. Галасаванне адбываецца па кожнай кандыдатуры ў члены Праўлення.

Члены Праўлення выбіраюцца тэрмінам на 5 (пяць) гадоў.

Паводле рашэння Агульнага сходу можа быць прынята рашэнне пра выплату ўзнагароды членам Праўлення Асацыяцыі.

Агульны сход можа прыняць рашэнне пра спыненне паўнамоцтваў датэрмінова, як асобнага члена Праўлення Асацыяцыі, так і ўсіх членаў Праўлення Асацыяцыі адначасова. Рашэнні ў такіх выпадках прымаюцца Агульным сходам кваліфікаванай большасцю галасоў (не меней за тра чацвёртых) ад агульнага ліку галасоў членаў Асацыяцыі (іх прадстаўнікоў), што прысутнічаюць на паседжанні Агульнага сходу.

13.3. Паседжанні Праўлення Асацыяцыі з'яўляюцца правамоцнымі, калі ў іх бярэ ўдзел большасць членаў Праўлення Асацыяцыі.

Паводле рашэння Праўлення Асацыяцыі для ўдзелу ў паседжанні Праўлення Асацыяцыі з правам дарадчага голасу могуць быць запрошаны асобы, якія не з'яўляюцца членамі Праўлення Асацыяцыі.

Рашэнне пра скліканне паседжання Праўлення мае права прыняць:

- Старшыня Асацыяцыі;
- член Праўлення Асацыяцыі;
- Рэвізор.

Пра месца, час правядзення паседжанняў Праўлення Асацыяцыі, а таксама пра парадак дня, членам Праўлення Асацыяцыі неабходна паведаміць не пазней чым за 2 (два) працоўныя дні да вызначанай даты. Паведамленне можа ажыццяўляцца па электронных адрасах членаў Праўлення Асацыяцыі, пазначаных імі пры выбранні ў члены Праўлення Асацыяцыі.

13.4. У выпадках неабходнасці рашэнне можа быць прынята метадам апытання. Парадак прыняцця рашэнняў шляхам апытання вызначаецца Праўленнем.

13.5. Праўленне Асацыяцыі:

13.5.1. арганізуе выкананне рашэнняў Агульнага сходу;

13.5.2. распрацоўвае і рэалізуе мэтавыя праграмы на аснове прынятых Агульным сходам асноўных напрамкаў дзейнасці Асацыяцыі;

13.5.3. распрацоўвае каштарысы выдаткаў Асацыяцыі (змяненняў і дадаткаў да іх) для іх зацвярджэння Агульным сходам;

13.5.4. ажыццяўляе падрыхтоўку праекта змяненняў (дадаткаў) у статут і яго ўнясенне на разгляд Агульнага сходу;

13.5.5. зацвярджае па прапанове Старшыні Асацыяцыі бягучыя і перспектыўныя планы дзейнасці Асацыяцыі;

13.5.6. выносіць рашэнні пра прыцягненне Старшыні Асацыяцыі да маёмаснай адказнасці;

13.5.7. ажыццяўляе кантроль за дзейнасцю Старшыні Асацыяцыі, не ўмешваючыся пры гэтым у яго аператыўна-распарадчую дзейнасць;

13.5.8. прыцягвае аўдытараў для праверкі дзейнасці Асацыяцыі;

13.5.9. прадстаўляе Агульнаму сходу прапановы і водзывы пра гадавы баланс Асацыяцыі і праект рашэння пра напрамкі выкарыстання прыбытку і парадку пакрыцця страт Асацыяцыі;

13.5.10. выбірае Старшыню Асацыяцыі тэрмінам на 5 гадоў, прымае рашэнне пра датэрміновае спыненне паўнамоцтваў Старшыні Асацыяцыі, заключэнне і спыненне працоўнай дамовы (кантракта) са Старшынёй Асацыяцыі, вызначае асобу, якая ад імя Асацыяцыі падпісвае працоўную дамову (кантракт) са Старшынёй Асацыяцыі;

13.5.11. прымае рашэнне пра ўдзел у якасці члена ў іншых некамерцыйных арганізацыях, а таксама прымае рашэнне пра пералік членскіх і іншых унёскаў, членам якіх з'яўляецца Асацыяцыя;

13.5.12. прадстаўляе на разгляд Агульнага сходу пытанне пра выключэнне са складу членаў Асацыяцыі;

13.5.13. зацвярджае палажэнні пра філіялы (прадстаўніцтвы) Асацыяцыі; выбірае і спыняе паўнамоцтвы кіраўнікоў філіялаў (прадстаўніцтваў) Асацыяцыі;

13.5.14. прымае рашэнні пра фарміраванне камітэтаў, камісій Асацыяцыі, зацвярджэнне палажэнняў пра іх (унясенне змяненняў і дадаткаў у такія палажэнні), ажыццяўляе кантроль за дзейнасцю камітэтаў і камісій Асацыяцыі;

13.5.15. ажыццяўляе кантроль за выкананнем палажэнняў статута, а таксама палажэнняў лакальных нарматыўных прававых актаў Асацыяцыі;

13.5.16. прызначае на пасаду галоўнага бухгалтара Асацыяцыі (спыненне, скасаванне, змяненне працоўнага кантракту з ім);

13.5.17. заслухоўвае справаздачы Старшыні Асацыяцыі пра правядзенне мерапрыемстваў Асацыяцыі;

13.5.18. вызначае змест і аб'ём дадатковых звестак, якія з'яўляюцца канфідэнцыйнай інфармацыяй, што не падлягае разгалашэнню;

13.5.19. прымае рашэнне пра здзяйсненне Асацыяцыяй здзелак па адчужэнні нерухомасці, а таксама бязвыплатных здзелак, дамоваў даручальніцтва і закладу;

13.5.20. прымае рашэнне пра стварэнне і (ці) ліквідацыю адасобленых падраздзяленняў (філіялаў, прадстаўніцтваў), а таксама прымае рашэнне пра ўдзел у іншых арганізацыях і вырашэнне іншых пытанняў, звязаных з удзелам у такіх арганізацыях;

13.5.21. вызначае памеры, перыядычнасць і тэрміны ўнясення ўступнага, членскага і іншых унёскаў членамі Асацыяцыі;

13.5.22. вызначае крытэрыі членства ў Асацыяцыі;

13.5.23. ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы, якія не ўваходзяць у кампетэнцыю Агульнага сходу.

Праўленне Асацыяцыі не мае права даручаць ці перадаваць выкананне сваіх функцый іншым органам Асацыяцыі.

## ГЛАВА 14
## ВЫКАНАЎЧЫ ОРГАН

14.1. Выканаўчым органам Асацыяцыі з'яўляецца Старшыня Асацыяцыі. Ён ажыццяўляе бягучае кіраўніцтва дзейнасцю Асацыяцыі і Праўленнем Асацыяцыі, забяспечвае выкананне рашэнняў Агульнага сходу і іншых органаў Асацыяцыі, нясе адказнасць за дзейнасць Асацыяцыі.

Старшыня Асацыяцыі абіраецца Праўленнем на тэрмін 5 гадоў, дзейнічае на падставе статута і працоўнай дамовы (кантракту). Старшыня Асацыяцыі можа быць абраны з ліку членаў Праўлення.

Старшыня Асацыяцыі выбіраецца кваліфікаванай большасцю (не меней за 90 %) галасоў ад агульнага ліку галасоў членаў Праўлення.

У выпадку калі ніводным з кандыдатаў на пасаду Старшыні не набрана колькасць галасоў, прадугледжаная часткай 3 дадзенага пункта, паўнамоцтвы дзейснага Старшыні прадаўжаюцца да моманту выбрання новага Старшыні.

Старшыня Асацыяцыі павінен даваць справаздачу Агульнаму сходу і Праўленню Асацыяцыі па ўсіх пытаннях сваёй дзейнасці.

14.2. Працоўны кантракт са Старшынёй Асацыяцыі ад імя Асацыяцыі падпісвае асоба, вызначаная Праўленнем Асацыяцыі.

14.3. Старшыня Асацыяцыі:

14.3.1. без даверанасці дзейнічае ад імя Асацыяцыі, прадстаўляе яе інтарэсы;

14.3.2. выконвае рашэнні Агульнага сходу;

14.3.3. займаецца аператыўным кіраваннем і бягучай арганізацыйнай дзейнасцю Асацыяцыі ў адпаведнасці са статутам;

14.3.4. здзяйсняе здзелкі ад імя Асацыяцыі, выдае даверанасці з улікам абмежаванняў, вызначаных статутам;

14.3.5. адкрывае разліковыя і іншыя рахункі Асацыяцыі ва ўстановах банка;

14.3.6. вядзе спіс членаў Асацыяцыі;

14.3.7. распрацоўвае і прадстаўляе для зацвярджэння Праўленнем Асацыяцыі бягучыя і перспектыўныя планы дзейнасці Асацыяцыі;

14.3.8. падпісвае ад імя Асацыяцыі дакументы, у тым ліку заявы, дамовы, кантракты, пагадненні і г.д.;

14.3.9. зацвярджае штатны расклад Асацыяцыі, прымае на працу і звальняе працаўнікоў Асацыяцыі;

14.3.10. выдае загады і дае ўказанні, абавязковыя для выканання ўсімі працаўнікамі Асацыяцыі, у адпаведнасці з правіламі ўнутранага працоўнага распарадку прымае ў дачыненні да працаўнікоў Асацыяцыі меры заахвочвання і накладвае дысцыплінарныя спагнанні;

14.3.11. штогод дае справаздачу перад Агульным сходам пра вынікі працы за мінулы год, у тым ліку пра паступленне і выдаткаванне сродкаў, выкананне штатнай, фінансавай і працоўнай дысцыпліны, дакладнасць справаздачнасці;

14.3.12. прадстаўляе Праўленню Асацыяцыі справаздачы пра правядзенне мерапрыемстваў Асацыяцыі;

14.3.13. карыстаецца правам распараджэння маёмасцю і сродкамі Асацыяцыі ў межах сваёй кампетэнцыі ў адпаведнасці са статутам і заключаным з ім працоўным кантрактам;

14.3.14. арганізуе падрыхтоўку, скліканне і правядзенне паседжанняў Агульнага сходу;

14.3.15. даводзіць да ўсіх членаў Асацыяцыі рашэнні Агульнага сходу, ажыццяўляе кантроль за выкананнем такіх рашэнняў;

14.3.16. садзейнічае дзейнасці камітэтаў і камісій Асацыяцыі і забяспечвае яе, выкарыстоўваючы рэсурсы і магчымасці Асацыяцыі;

14.3.17. арганізуе працу Праўлення Асацыяцыі, склікае і праводзіць паседжанні Праўлення Асацыяцыі, старшынствуе на іх;

14.3.18. вызначае час, месца, пытанні парадку дня паседжання Праўлення Асацыяцыі і дакладчыкаў па іх;

14.3.19. кантралюе выкананне рашэнняў Праўлення Асацыяцыі, а таксама даручэнняў, дадзеных яму Агульным сходам і/ці Праўленнем Асацыяцыі;

14.3.20. арганізуе працэдуру па правядзенні паседжання Праўлення Асацыяцыі метадам апытання паводле статута;

14.3.21. прызначае асобу, адказную за вядзенне пратакола паседжанняў Праўлення Асацыяцыі, ці самастойна вядзе пратакол;

14.3.22. ажыццяўляе кантроль за выкананнем рашэнняў Праўлення Асацыяцыі;

14.3.23. штогод падчас правядзення гадавога Агульнага сходу дае справаздачу перад Агульным сходам па выніках працы за год Праўлення Асацыяцыі;

14.3.24. вырашае іншыя пытанні, не аднесеныя да кампетэнцыі іншых органаў кіравання Асацыяцыі.

## ГЛАВА 15
## СТРУКТУРА І КАМПЕТЭНЦЫЯ ОРГАНАЎ КАНТРОЛЮ

15.1. Для ажыццяўлення ўнутранага кантролю дзейнасці Асацыяцыі Агульны сход выбірае Рэвізора тэрмінам на 4 гады. Рэвізорам не можа быць выбраны Старшыня Асацыяцыі, члены Праўлення Асацыяцыі і галоўны бухгалтар Асацыяцыі.

15.2. Рэвізор Асацыяцыі:

15.2.1. ажыццяўляе кантроль за адпаведнасцю дзейнасці Асацыяцыі заканадаўству Рэспублікі Беларусь і статуту;

15.2.2. паводле рашэння органаў кіравання Асацыяцыі ў вызначаныя імі тэрміны ажыццяўляе правядзенне рэвізій ці праверак;

15.2.3. кантралюе дзейнасць выбарных органаў і службовых асоб Асацыяцыі, юрыдычных асоб, заснаваных Асацыяцыяй;

15.2.4. кантралюе фінансава-гаспадарчую дзейнасць Асацыяцыі і вядзенне ўліку матэрыяльных каштоўнасцяў і грашовых сродкаў;

15.2.5. кантралюе выкананне патрабаванняў статута членамі Асацыяцыі;

15.2.6. правярае арганізацыю справаводства і справаздачнасці Асацыяцыі, своечасовасць і правільнасць адказаў на лісты, скаргі і заявы, якія паступілі ў Асацыяцыю;

15.2.7. мае права прысутнічаць на паседжаннях Праўлення Асацыяцыі з правам дарадчага голасу, а таксама выступіць ініцыятарам склікання і правядзення паседжання Праўлення Асацыяцыі.

Рэвізор мае права ў любы час па ўласнай ініцыятыве правесці рэвізію ці праверку. Працягласць рэвізіі ці праверкі не павінна перавышаць 30 (трыццаць) дзён з моманту пачатку яе правядзення.

15.3. Па патрабаванні Рэвізора члены органаў кіравання Асацыяцыі і працаўнікі Асацыяцыі, якім прадстаўлена права прыняцця рашэнняў, што вынікаюць з іх паўнамоцтваў, працоўных ці звязаных з імі адносін, абавязаны ў вызначаны тэрмін прадставіць неабходныя для правядзення рэвізіі ці праверкі дакументы пра дзейнасць Асацыяцыі, а таксама даць тлумачэнні ў вуснай і (ці) пісьмовай форме.

15.4. Рэвізор па выніках праведзенай рэвізіі ці праверкі складае заключэнне. Рэвізор у выпадку выяўлення парушэнняў абавязаны:

15.4.1. прадставіць заключэнне рэвізіі ці праверкі або асобныя іх высновы і прапановы органам кіравання Асацыяцыі, якія ў адпаведнасці з іх кампетэнцыяй у дзесяцідзённы тэрмін абавязаны прыняць меры па ліквідаванні дапушчаных парушэнняў;

15.4.2. запатрабаваць склікання пазачарговага Агульнага сходу, калі па фактах парушэнняў, выяўленых падчас рэвізіі ці праверкі, рашэнне можа быць прынята толькі гэтым сходам.

15.5. Для правядзення праверкі бухгалтарскага ўліку, бухгалтарскай (фінансавай) справаздачнасці і іншых дакументаў, а пры неабходнасці - і (ці) праверкі дзейнасці Асацыяцыі, яе філіялаў і прадстаўніцтваў, якая павінна адлюстроўвацца ў бухгалтарскай (фінансавай) справаздачнасці, Асацыяцыя мае права, а ў выпадках і парадку, вызначаных заканадаўствам, абавязана прыцягнуць аўдытарскую арганізацыю (аўдытара - індывідуальнага прадпрымальніка), не звязаную маёмаснымі інтарэсамі з Асацыяцыяй ці яе членамі (знешні аўдыт).

## ГЛАВА 16
## КАМЕРЦЫЙНАЯ ТАЙНА АСАЦЫЯЦЫІ

16.1. Склад і аб'ём звестак, што складаюць камерцыйную тайну Асацыяцыі, парадак іх абароны можа вызначацца Палажэннем пра камерцыйную тайну Асацыяцыі (пры ўмове выканання заканадаўства Рэспублікі Беларусь).

16.2. Праўленне Асацыяцыі мае права вызначаць змест і аб'ём дадатковых звестак, якія з'яўляюцца канфідэнцыйнай інфармацыяй, што не падлягае разгалашэнню.

## ГЛАВА 17
## УНЯСЕННЕ ЗМЯНЕННЯЎ І ДАДАТКАЎ У СТАТУТ АСАЦЫЯЦЫІ

17.1. Унясенне змяненняў і дадаткаў у статут (зацвярджэнне статута ў новай рэдакцыі) ажыццяўляецца паводле рашэння Агульнага сходу.

17.2. Падрыхтоўка праекта змяненняў і (ці) дадаткаў у статут Асацыяцыі (праекта Статута Асацыяцыі ў новай рэдакцыі) ажыццяўляецца Праўленнем Асацыяцыі асабіста або з удзелам прыцягнутых ім спецыялістаў, і выносіцца на разгляд і зацвярджэнне Агульнага сходу.

17.3. У выпадку прыняцця Агульным сходам рашэння пра ўнясенне змяненняў і (ці) дадаткаў у статут Асацыяцыі (пра зацвярджэнне статута ў новай рэдакцыі), Старшыня Асацыяцыі звяртаецца ва ўпаўнаважаны дзяржаўны орган па дзяржаўную рэгістрацыю адпаведных змяненняў і (ці) дадаткаў у статут Асацыяцыі (статута Асацыяцыі ў новай рэдакцыі).

## ГЛАВА 18
## РЭАРГАНІЗАЦЫЯ І ЛІКВІДАЦЫЯ АСАЦЫЯЦЫІ

18.1. Рэарганізацыя Асацыяцыі можа быць здзейснена паводле рашэння Агульнага сходу, а ў выпадках, вызначаных заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь - паводле рашэння суда. Рэарганізацыя Асацыяцыі можа быць здзейснена ў любых формах, прадугледжаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

18.2. Пры рэарганізацыі Асацыяцыі орган, які прыняў рашэнне пра рэарганізацыю, абавязаны пісьмова паведаміць пра гэта крэдыторам Асацыяцыі.

18.3. Пры рэарганізацыі Асацыяцыі, у выпадках, вызначаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, складаецца перадатачны акт ці раздзяляльны баланс, якія павінны змяшчаць палажэнні пра правапераемства па ўсіх абавязацельствах Асацыяцыі ў дачыненні да ўсіх яе крэдытораў і даўжнікоў, уключаючы і абавязацельствы, якія аспрэчваюцца бакамі.

Перадатачны акт і раздзяляльны баланс зацвярджаюцца Агульным сходам.

18.4. Асацыяцыя можа быць ліквідавана паводле рашэння:

18.4.1. Агульнага сходу;

18.4.2. эканамічнага суда ў выпадках, вызначаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

18.4.3. рэгіструючага органа ў выпадках, вызначаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

18.5. Ліквідацыя Асацыяцыі цягне за сабой спыненне яе дзейнасці без пераходу правоў і абавязкаў у парадку правапераемства да іншых асоб, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі.

18.6. Працэс рэарганізацыі і ліквідацыі Асацыяцыі ажыццяўляецца ў парадку і на ўмовах, прадугледжаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

18.7. Пры ліквідацыі Асацыяцыі маёмасць, што застаецца пасля задавальнення патрабаванняў яе крэдытораў, не падлягае размеркаванню паміж яе членамі, а накіроўваецца на мэты, прадугледжаныя дадзеным статутам.

**Подпісы Заснавальнікаў:**

**ТДА «Дызайн-студыя «НОТАБЕНЕ»**
у асобе дырэктара Анціпавай Т.А.,
што дзейнічае паводле Статута ______________________________

**ТАА «Чацвёрты квартал»**
у асобе прадстаўніка Трусава А.Г.,
што дзейнічае паводле даверанасці
б/н ад 02.10.2017 г. ______________________________

**ТДА «Астула»**
у асобе дырэктара Матросавай А.М.,
што дзейнічае паводле Статута ______________________________